**НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, ЗА МІР, ДЭМАКРАТЫЮ І САЦЫЯЛІЗМ!**

*(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 1 МАЯ 1981 г.).*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
30
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 17 [1317]
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.




## НА МІТЫНГУ

афгана-савецкай дружбы, прысвечаным 3-й гадавіне Афганскай красавіцкай рэвалюцыі, выступілі прэзідэнт студэнцкага зямляцтва брацкай краіны Ахтарголь Жадран, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па інтэрнацыянальнай рабоце Л. Гайдукевіч, студэнт 2-га курса гістарычнага факультэта В. Шадурскі і іншыя. Прысутнічалі прадстаўнікі зямляцтваў ГДР і В'етнама. Да бюста У. І. Леніна былі ўскладзены жывыя кветкі.

А. ЦВЯХ.

## АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ

развіцця геаграфічнай навукі ішла гаворка на сустрэчы выпускнікоў сярэдніх школ і школ працоўнай моладзі з выкладчыкамі і супрацоўнікамі геафака, якая адбылася на факультэце ў дзень адкрытых дзвярэй. Гасцямі студэнтаў сталі школьнікі Мінска, Барысава, Ждановічаў, Калодзішчаў, Стаўбцоў і іншых гарадоў і пасёлкаў Мінскага раёна. З факультэтам іх пазнаёмілі намеснік дэкана Р. А. Жмойдзяк, прафесар В. Ф. Якушка, дацэнты Г. Я. Рылюк, І. І. Пірожнік, Г. С. Смалякоў, М. А. Мялешка. На сустрэчы прысутнічала больш чым 100 чалавек.

Л. МАР'ІНА.

## З ВЕТЭРАНАМ ВАЙНЫ

Канстанцінам Аляксандравічам Груздзевым, аўтарам вядомых кніг «Салдаты партызанскага фронту», «У гады суровых выпрабаванняў» і былымі партызанамі венграмі Шандарам Надзь і Фрэнцам Малдавані сустрэліся студэнты факультэта журналістыкі. Баявыя таварышы ўсхвалявана расказвалі аб гераічным партызанскім жыцці.

Т. МАЗЕЦ.

## АДБЫЎСЯ СЕМІНАР

Мінскага абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навучальных устаноў па пытанню паляпшэння грамадскага харчавання студэнтаў ВНУ г. Мінска. Выступілі: санітарны ўрач гарадской СЭС Л. А. Шкляр, інжынер-тэхнолаг упраўлення грамадскага харчавання Мінгарвыканкома В. М. Нячаева, загадчык жыллёва-бытавога аддзела Мінскага абкома прафсаюза І. Р. Ткачэнка. Аб стане грамадскага харчавання ва універсітэце расказаў намеснік старшыні прафкома В. А. Бляеў.

Б. ВАЛЯНЦІНАЎ.

# СВЯТА МІРУ І ДРУЖБЫ

Усё прагрэсіўнае чалавецтва зямлі адзначае свята людзей працы — Першае мая. У калонах дэманстрантаў, на мітынгах і сходах пануе прыўзнятая, святочная атмасфера, а баявы заклік «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» адгукаецца ў сэрцы кожнага, каму дарагая справа міру і дружбы, хто жадае жыць шчаслiва і радасна, бачыць яснае сонца і блакітнае неба.

Свята Першамая збярэ пад свае сцягі людзей розных краін і нацыянальнасцей, людзей рознага ўзросту і прафесій, бо сёння, як ніколі раней, патрэбны стойкасць і згуртаванасць, каб даць рашучы адпор сілам імперыялізму і рэакцыі, чорным зданям вайны, што пнуцца замахнуцца на жыццё кожнага з нас атамнай бомбай. Людзі зямлі гавораць: «Не — вайне!», «Няхай заўжды будзе сонца!». І ў першых шарэнгах шматмільённых барацьбітоў за мір будуць крочыць савецкія людзі, стваральнікі самага прагрэсіўнага грамадскага ладу — камунізму.

Для нас, студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ імя У. І. Леніна, сёлетняе свята — гэта Першамай XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда Кампартыі Беларусі, Першамай стартавага года адзінаццатай пяцігодкі, Першамай юбілею роднага універсітэта. Вось чаму ён з'яўляецца своеасаблівым і дарагім, вось чаму ён такі светлы і радасны.

Нам ёсць чым ганарыцца, ёсць чаму радавацца. XXVI з'езд роднай Камуністычнай партыі адкрыў перад кожным савецкім чалавекам светлыя шляхі мірнай, стваральнай працы. Не апошняя роля ў эканамічным і сацыяльным развіцці краіны адводзіцца савецкім вучоным, работнікам вышэйшых навучальных устаноў, слаўнай студэнцкай моладзі. Гэта абавязвае кожнага з нас аддаваць гарачыню сваіх палымяных сэрцаў, уменне, талент і веды агульнай справе — далейшаму росквіту роднай Айчыны.

У час дэманстрацыі мы будзем рапартаваць мудрай партыі Леніна пра плён нашых велічных спраў, аб нашай рашучасці і далей крочыць дарогай у светлую краіну ведаў. Транспаранты і лозунгі раскажуць пра вучобу і адпачынак, пра навуковую і грамадска-палітычную дзейнасць, пра той важкі ўклад, што зрабіў універсітэт у агульную скарбонку савецкай навукі.

— НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, ЗА МІР, ДЭМАКРАТЫЮ І САЦЫЯЛІЗМ!

Са святам, паважаныя таварышы!

ПАРТКОМ
РЭКТАРАТ
МЯСЦКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФКОМ




**ПРАШУ СЛОВА**

# ПЕРШАМАЙСКІЯ ПАЖАДАННІ

**У. Аджаеў, сакратар камітэта камсамола фізфака:**

— З прыходам першамайскага свята наступае цудоўная студэнцкая пара — сесія. Няхай яна будзе добрай для ўсіх студэнтаў і асабліва для тых, хто развітваецца з універсітэтам, для каго яна апошняя. Запоўняцца радкі залікоўкі, але наперадзе яшчэ не адзін экзамен, не адзін залік на шляху станаўлення. Творчага пошуку, неспакою і поспехаў, выпускнік-81!

**Л. Берднік, студэнтка III курса факультэта журналістыкі:**

— Наш факультэт па праву можна назваць інтэрнацыянальным, бо вучацца тут студэнты з трыццаці краін свету. Ад шчырага сэрца хочацца павіншаваць замежных студэнтаў з Міжнародным днём салідарнасці працоўных. Хутчэй авалодвайце навукамі, сябры, бо на радзіме чакаюць вашых сіл і ведаў для стваральнай працы.

**В. Шхіньян, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту:**

— Хочацца пажадаць студэнтам быць такімі ж мэтанакіраванымі, моцнымі духам, цвёрдымі характарам, як выкладчыкі; а выкладчыкам — такімі ж вясёлымі, жыццярадаснымі, бадзёрымі, як студэнты.

**А. Шыбут, начальнік штаба працоўных спраў камітэта камсамола БДУ:**

— Штаб працоўных спраў камітэта камсамола далучаецца да першамайскіх віншаванняў і ад усёй душы прапаноўвае тым, хто ўжо быў байцом СБА, пабыць ім яшчэ раз. Каму гэта пакуль што не ўдавалася — не хвалявацца, што едзе ўпершыню. Мы можам гарантаваць — пажадаеце паехаць і ў наступнае лета. Сонечных дзён вам, сябры!

● НДІ ПФП — 10 ГОД ●

# НАТХНЯЮЧЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

НАВУКОВА - ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ прыкладных фізічных праблем арганізаваны ў красавіку 1971 года на базе праблемнай лабараторыі паўправадніковай тэхнікі, навукова-даследчых лабараторый ядзернай фізікі і фізічнай электронікі, а таксама навукова-даследчых груп розных кафедр Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Тэматыка навуковых даследаванняў інстытута з моманту яго арганізацыі і да гэтага часу цесна звязана з асноўнымі спецыяльнасцямі і галінамі ведаў, па якіх фізічны і радыёфізічны факультэты БДУ імя У. І. Леніна здзяйсняюць падрыхтоўку кадраў для народнай гаспадаркі краіны.

Каля вытокаў зараджэння і развіцця асноўных напрамкаў навуковых даследаванняў інстытута стаялі вядомыя савецкія вучоныя. акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка і акадэмік АН БССР Л. У. Валадзько.

Пры стварэнні інстытута ў якасці асноўных былі зацверджаны напрамкі навуковых даследаванняў у галінах фізічнай оптыкі, спектраскапіі і люмінесцэнцыі, фізікі паўправаднікоў, радыёфізікі і электроннага прыладабудавання.

За дзесяцігадовы перыяд свайго існавання НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі дабіўся значных вынікаў. Аб гэтым, у прыватнасці, гаворыць і той факт, што па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1980 год інстытуту прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг і першае месца Мінвуза СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў. Гэта, безумоўна, важная перамога калектыву, якая падводзіць вынік дзесяцігадоваму перыяду яго існавання.

Відавочны рост навуковай кваліфікацыі — інтэлектуальнага патэнцыялу інстытута. Колькасць супрацоўнікаў інстытута з вучонай ступенню за дзесятую пяцігодку ўзрасла ў 1,5 раза і дасягнула 77 чалавек. Фактычна кожны трэці навуковы супрацоўнік інстытута (або кожны дзесяты з агульнай колькасці) — са ступенню! Гэта нядрэнны рэзультат, хаця ў пытанні аб падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі ад інстытута чакаецца большае. Гэта ў першую чаргу датычыцца падрыхтоўкі дактароў навук.

Істотна палепшыліся асноўныя паказчыкі навукова-даследчай дзейнасці інстытута. Аб'ём дзяржбюджэтных і гасдагаворных НДР у 1980 годзе склаў 4 мільёны рублёў; у параўнанні з 1976 годам ён узрос у 1,5 раза. За гэты перыяд адносная колькасць важнейшых тэм дасягнула 100 працэнтаў па дзяржбюджэтнай тэматыцы і павялічылася з 30 працэнтаў да 70 па гасдагаворнай тэматыцы.

Зараз інстытут у кааперацыі з многімі арганізацыямі краіны вядзе работы па рашэнню 8 буйных агульнасаюзных і рэспубліканскіх комплексных праграм. Гэтымі праграмамі ахопліваецца цэлы шэраг ключавых праблем эксперыментальнай фізікі, мікраэлектронікі, навуковага прыладабудавання.

Дасягнуты дастаткова высокі ўзровень канцэнтрацыі сіл і сродкаў на важных напрамках развіцця навукі і тэхнікі. Іменна таму патрэбна чакаць ад калектыву інстытута больш істотных навуковых рэзультатаў.

Заслугоўвае адабрэння дзейнасць інстытута па публікацыях навуковых прац супрацоўнікаў. Колькасць публікацый за апошнія чатыры гады (з 1976 года) вырасла больш чым у 2 разы, ад 208 да 440. З іх істотная частка (прыкладна 30 працэнтаў) прац прадстаўлена ў міжнародных і ўсесаюзных навукова-тэхнічных часопісах.

У калектыве інстытута, асабліва сярод вядучых супрацоўнікаў — загадчыкаў аддзелаў і лабараторый — вядзецца мэтанакіраваная работа па выданню фундаментальных навуковых прац у выглядзе манаграфій, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў. Зараз у актыве інстытута ёсць 14 апублікаваных манаграфій і вучэбных дапаможнікаў (з іх 7 — у 1980 годзе).

Пастаянна паляпшаецца вынаходніцкая дзейнасць: у 1980 годзе інстытут атрымаў 137 аўтарскіх пасведчанняў і станоўчых рашэнняў, было пададзена 155 заяў на вынаходніцтвы. У 1980 годзе ўпершыню атрыманы патэнт ЗША.

Новы аспект сённяшняй работы інстытута — у паяўленні даследаванняў і распрацовак, накіраваных на ўкараненне рэзультатаў НДР непасрэдна ў прамысловасць.

Да катэгорыі гэтых работ належыць у першую чаргу аднесці распрацаваны аддзелам спектраскапіі і люмінесцэнцыі новы тэхналагічны працэс атрымання цеплаізаляцыйных матэрыялаў з адходаў нафтавай прамысловасці.

У якасці станоўчага аспекту неабходна адзначыць істотны рост эканамічнай эфектыўнасці работы інстытута. У 1979 годзе эканамічны эфект дасягнуў значных размераў — 8 мільёнаў рублёў, што ў 8 разоў перавышае гэты паказчык у 1976 годзе.

Нармальна развіваюцца традыцыйныя формы сувязі інстытута з кафедрамі універсітэта: сумесна з прафесарска-выкладчыцкім саставам выконваецца асноўны аб'ём навуковых даследаванняў па дзяржбюджэтнай тэматыцы; супрацоўнікі інстытута чытаюць лекцыі, вядуць практычныя заняткі, кіруюць дыпломнымі і курсавымі работамі.

Важны бок дзейнасці інстытута заключаецца ў арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў, што з'яўляецца адной з важнейшых умоў паляпшэння падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, павышэння іх кваліфікацыі.

З першых дзён свайго існавання інстытут стаў базай для студэнцкай НДР. Штогод у навукова-даследчай рабоце па дзяржбюджэтнай і гасдагаворнай тэматыцы прымае ўдзел звыш 300 студэнтаў фізічнага, радыёфізічнага, біялагічнага, хімічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна.

Адзначаючы ў цэлым станоўчыя аспекты работы інстытута ў гэтым напрамку, трэба падкрэсліць настойлівую неабходнасць удасканалення форм сувязі лабараторый інстытута з кафедрамі універсітэта. Эфектыўнага ўзаемадзеяння можна дасягнуць толькі на аснове двухбаковай зацікаўленасці і намаганняў дэканаў, кафедр, аддзелаў і лабараторый.

Такім чынам, у наяўнасці пэўныя поспехі дзейнасці інстытута і яго магчымасці, якія ўзраслі. Справа ў тым, каб, абапіраючыся на навуковы патэнцыял, які ёсць, рацыянальна вызначыць перспектывы далейшага развіцця, выпрацаваць і няўхільна выконваць праграму работ па рэалізацыі гэтых перспектыў.

**А. ЧАРНЯЎСКІ,**
**дырэктар інстытута прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі.**

● З НАШАЙ ПОШТЫ ●

# ВЕЧАР ДРУЖЫ

НЯДАЎНА ў галоўным корпусе БДУ імя У. І. Леніна адбыўся вечар, прысвечаны 35-годдзю з дня заваявання сірыйскім народам незалежнасці, вызвалення краіны ад французскіх захопнікаў.

Кожны год сірыйцы адзначаюць сваё нацыянальнае свята.

У гэтым годзе ўрачыстае пасяджэнне адкрыў студэнт медыцынскага інстытута Сухель Жазар.

Ад імя студэнтаў арабскіх краін з прывітальным словам выступіў студэнт факультэта журналістыкі Мухамед Альван Хасуна. На вечар прыйшлі павіншаваць сваіх сяброў з Сірыі студэнты мінскіх вышэйшых навучальных устаноў, а таксама госці з Гродна і Ліпецка.

**МУХАМЕД ЮСЭФ ХУСЕІН,**
**студэнт 1-га курса журфака.**

● НАШЫ ЮБІЛЯРЫ ●

# «ХАЧУ БЫЦЬ ЧАЛАВЕЧНЫМ...»

Ёсць людзі, з якімі нават пры першай сустрэчы адчуваеш нейкую незвычайную цеплыню душы, непасрэдную чалавечую шчырасць. Іменна да такіх з упэўненасцю адносіш прафесара А. А. Лойку, выкладчыка кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта. Чалавека энергічнага, бадзёрага. З той раніцы, калі А. А. Лойка ўпершыню ўвайшоў у аўдыторыю ўжо не як студэнт, а як выкладчык, жыццё перагарнула не адну сваю старонку. І размову можна пачынаць з навуковай працы, з паэтычных зборнікаў або выкладчыцкай работы. Аднак, несумненна, ён пачынае з расказа аб «Узлёце» — універсітэцкім літаб'яднанні. «Узлётам» ён ганарыцца, аб ім можа гаварыць бясконца. Нараджэннем літаб'яднання універсітэт абавязаны Алегу Антонавічу. Да 1964 года ў БДУ існаваў толькі творчы літаратурны гурток. Але гурток заставаўся гуртком. А патрэбна было пашыраць яго рамкі. Так паяўляецца «Узлёт», стаўшы сапраўды своеасаблівай узлётнай «паласой» на шырокі шлях у літаратуру для многіх вядомых сёння паэтаў і пісьменнікаў. Сярод выхаванцаў Лойкі — Яўгенія Янішчыц, Генадзь Пашкоў — лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола Беларусі; Юрка Голуб, Алесь Разанаў, Сяргей Законнікаў і іншыя. Кожны на сваім рахунку мае ўжо не адзін зборнік. Алесь Жук за свае празаічныя творы атрымаў званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Узаемаадносіны з маладымі — тое, чым жыве, працуе гэты неспакойны чалавек. Нягледзячы на 50-гадовы ўзрост, ён так па-юнацку бадзёра бярэцца за кожнае пачынанне, што толькі можна здзіўляцца. «Яны ўзбагачаюць мяне, гэтыя хлопцы і дзяўчаты. Сам пачынаеш глядзець па-новаму на многія з'явы жыцця, адчуваеш яго тэмп, шырэй глядзіш навокал. Калектыў «Узлёту» — жывы матэрыял, які патрэбна пастаянна асэнсоўваць»,—заўважае мой субяседнік.

Алег Антонавіч заўсёды тонка адчувае паэтычную нотку ў душы студэнтаў (а іх нямала), якія прыходзяць да яго, часам з наіўным пытаннем: ці змагу я стаць паэтам? І тут галоўнае не параніць чалавека жорсткім «не». Такога ад Алега Антонавіча не пачуш. Галоўнае, не адштурхнуць ад літаратуры, не абарваць цягу да яе. Паэтам, можа, і не стане, але ж будзе цудоўным выкладчыкам, настаўнікам у школе або літаратуразнаўцам. У друку выйшлі тры зборнікі «ўзлётаўцаў». Апошні, «Вёсны», у 1977 годзе. Ён яшчэ раз сведчыць аб пастаянным творчым пошуку ў літаб'яднанні. А ў тым, што адзін з «узлётаўцаў», М. Губернатараў, кіруе літаб'яднаннем «Крокі» пры Гродзенскім універсітэце, ёсць свая пераемнасць.

А. А. Лойка плённа працуе на паэтычнай ніве. Сутнасць не ў колькасці зборнікаў (хаця іх хапае), а ў іх мастацкай значнасці. У кожным—блізкае, дарагое. Асабліва ў апошнім, «Лініі жыцця». Вынік разваг, падарожжаў. Ездзіць ён многа. Нястомны прапагандыст беларускай літаратуры выступаў у многіх ВНУ краіны, у Варшаўскім, Іенскім універсітэтах. А калі хто не пабываў на лекцыях у прафесара Лойкі, той многае страціў. Тут не дазволіш сабе займацца нечым непатрэбным, нават чытаць цікавую кнігу. Нягледзячы на гады практыкі, да кожнай лекцыі ён рыхтуецца з адказнасцю. Нездарма адным з самых прыемных дней А. А. Лойка называе дзень, калі лекцыя ўдаецца.

«Душа святкуе». У адным са сваіх вершаў паэт пісаў: «Паміж душаў людскіх ідучы — расхвалёваных, самых розных, падбіраю да кожнай ключы...» І хай не даволі часта бываюць адкрыцці, але галоўнае, што яны ёсць і абавязкова будуць яшчэ. Бо такім людзям, як А. А. Лойка, немагчыма не верыць.

**М. ЛАХВІЧ.**

● ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА ●





**Лекцыю па неарганічнай хіміі чытае дацэнт Галіна Ігнацьеўна ВАСІЛЬЕВА. Уважліва слухаюць яе першакурснікі вытворчага патоку.** **Фота В. ШАЧАКА.**



Марына ЧУМАКОВА — ленінская стыпендыятка ФПМ.
Фота В. ШАЧАКА.

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

# «СЛОН У... ДАМКАХ»

**12 сакавіка 1981 года ў газеце быў змешчаны фельетон У. Капскага «Слон у... дамках». У ім крытыкавалася арганізацыя правядзення агульнауніверсітэцкага турніру па шашках. Рэдакцыя атрымала адказ в. а. загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту С. Макарэвіча:**

«На выступленне газеты ад 12 лістапада г. г. паведамляем наступнае: пытанне аб шашачным турніры вырашалася на пасяджэнні судзейскай калегіі ў прысутнасці ўсіх прадстаўнікоў факультэтаў. Палажэнне аб тэрмінах правядзення спаборніцтваў і яго ўдзельніках можа быць зменена са згоды галоўнай судзейскай калегіі. Шляхам галасавання любы з пунктаў палажэння можна змяніць, прычым гэта не парушае спартыўнай этыкі. Галоўны суддзя спаборніцтваў таварыш М. Г. Рафальскі ўнёс праект змен аб прадстаўніцтве каманд на агульнае разгледжанне, і ён быў прыняты большасцю галасоў. Спрэчкі, якія ўзніклі ў час спаборніцтваў, можна растлумачыць не зусім дакладным палажэннем аб правядзенні спартакіяды.

Кафедра фізвыхавання і спорту, спартыўны клуб, ведаючы, што студэнцкая моладзь, прафесарска - выкладчыцкі састаў праяўляюць вялікую зацікаўленасць у развіцці шахмат і шашак ва універсітэце, неаднаразова ўзнімалі перад рэктаратам пытанне аб выдзяленні памяшкання для шахматна - шашачнага клуба. Рэктарат выдзеліў адну з вучэбных аўдыторый (плошчай 16 $м^2$) пад шахматна-шашачны клуб. Але гэта не можа задаволіць патрабаванням, бо колькасць тых, хто займаецца, пастаянна ўзрастае.

Пры правядзенні спаборніцтваў па шахматах і шашках неабходна мець шахматны гадзіннік. На кафедры ёсць неабходная колькасць гадзіннікаў, але пасля кожнага тура выходзяць са строю 4—5 гадзіннікаў з-за няўмелага карыстання, а рамонт цягнецца на працягу двух месяцаў».

# Па формуле радасці

Калі НА ХІМФАКУ вас сустракае велізарны, ростам у некалькі лесвічных пралётаў, Дон Кіхот; калі ў вестыбюлі гістарычнага факультэта вы бачыце магістраў сярэдніх стагоддзяў, апранутых у мантыі; калі ў ЭВМ-этажы (не блытаць з Эрмітажам) ФПМ спыняецеся перад вядомай групай Лаакаона, апутанай змяёй-перфастужкай; калі фізікі ашаламляюць мушкецёрскімі манерамі і лозунгам «Даёш 5 год навучання — за 3 гады», а дзверы дэканата мехмата становяцца ўваходам у рай — вы, зразумела, здагадаецеся, што трапілі на Дні факультэтаў, свята, якое ва універсітэце стала традыцыйным.

Чакаюць Дні першакурснікі, бо цэнтральнай падзеяй становіцца, як правіла, пасвячэнне ў студэнты. Да свята рыхтуюцца дэканы, бо амаль кожны з іх лічыць справай гонару асабістае выступленне з урачыстай прамовай. Ну, а пра турботы і клопаты аргкамітэта — легенды ходзяць.

Сапраўды, амаль адразу пасля вераснёўскай «бульбы» паяўляецца на хімфаку аб'ява з запрашэннем усіх, хто мае жаданне і здольнасці, прыняць удзел у падрыхтоўцы факультэцкага свята. Потым праходзіць даволі працяглы перыяд напісання сцэнарыяў, з якіх адбіраецца лепшы. А вось фізікі ствараюць сцэнарый калектыўна: кожны піша асобную частку. Як прыдумваюць свае выступленні астатнія? Па-рознаму. Мэта ва ўсіх адзіная: правесці свята цікава, непаўторна, па-студэнцку весела.

Традыцыйныя Дні ўвабралі ў сябе факультэцкія навуковыя канферэнцыі, экскурсіі будучых абітурыентаў у рамках «адкрытых дзвярэй». Не звязаныя яшчэ традыцыямі гісторыкі, у якіх такое свята праводзіцца толькі ў другі раз, прапанавалі дадатковыя формы: пасля Дня навукі арганізавалі Дзень СБА і Дзень спорту. Асаблівасцю Дзён радыёфізікаў, такіх жа юных, як Дні гістфака, стала сустрэча з былымі выпускнікамі факультэта.

У заканадаўцаў Дзён, нягледзячы на розніцу дэталяў, схема правядзення свят амаль аднолькавая: урачыстае адкрыццё, вечар-пасвячэнне, спартыўныя мерапрыемствы, капуснік, атракцыёны. Атракцыёны — плён уласнай фантазіі: ад традыцыйных гадалак і ціра да папулярнага ў гэтым сезоне «пакою жахаў». А чаго толькі не выйгравалі ўдзельнікі шматлікіх конкурсаў! Бублікі, білет на «ДФ-81», фотакартку любімага выкладчыка, «індульгенцыю», якая гарантуе аўтаматычны залік у чарговую сесію... На гістфаку з аукцыёна можна было прыдбаць сапраўдную, з подпісам дэкана, даведку на пропуск адной, а то і адной з паловай пары заняткаў... Студэнты ёсць студэнты!

І ўсё ж не будзем увогуле захапляцца здабыткамі студэнцкага гумару. Побач з удалымі былі і няўдалыя нумары і атракцыёны. Не заўсёды хапала арганізаванасці, прадуманасці, больш за ўсё — густу. Відаць, час адбярэ і выкрышталізуе вопыт лепшых.

Спынімся падрабязна на некаторых мерапрыемствах. Галоўнае з іх — пасвячэнне ў студэнты. Прыйшоў на факультэт першакурснік. Ён, кажуць, яшчэ не студэнт. І толькі, здаўшы першую сесію, пакаштаваўшы студэнцкага «хлеба», стане паўнапраўным членам студэнцкага брацтва. І гэта — свята. Старшакурснікі і на справе і са сцэны са значнай доляй гумару падзеляцца вопытам і «сакрэтамі» студэнцкага жыцця, пастараюцца перадаць малодшым шчырую і верную любоў да абранай спецыяльнасці.

Таму абавязковымі сталі непасрэдна перад пасвячэннем выступленні факультэцкіх агітбрыгад і факультэцкіх тэатраў. Уступныя экзамены і залічэнне ў ВНУ, «бульба» і сталоўка, стыпендыя і сесія — асноўная тэматыка неўміручай студэнцкай творчасці.

Вучэбныя пародыі выдаюць пачаткоўцаў у правядзенні Дзён. Як адзначылі фізікі, цяжка шмат гадоў запар жартаваць аб адным і тым жа. Яны і хімфакаўцы ўжо адышлі ад вузка студэнцкага гумару. Хімікі імкнуцца быць больш-менш сатырычнымі, вырашаць сродкамі сцэнічнага гумару агульначалавечыя пытанні, высмейваць парокі. І атрымліваецца гэта, трэба аддаць ім належнае, на дзіва ўдала і тактоўна. За гэтым — месяцы карпатлівай і часам нуднай штодзённай працы пасля лекцый і семінарскіх, курсавых і лабараторных...

Агаворымся, што на хімфаку і фізфаку іменна з Дзён выраслі студэнцкія тэатры, набыўшы свой твар, сваю тэматыку, сваю назву (у хімікаў— Мясцовы Хімічна-Аналітычны Тэатр — МХАТ).

У тэатра фізфака больш традыцыйная манера выканання ў параўнанні з хімікамі, ды і самі спектаклі больш класічныя. У гэтым годзе капрыз фантазіі звёў на сцэне актавай залы, дзе адбывалася пасвячэнне першакурснікаў-фізікаў, мушкецёраў і каварнага кардынала Рышэлье з прыватным дэтэктывам папулярных бестселераў. Каментарый па-за дзеяннем суадносіў сцэнічныя падзеі з сённяшнімі факультэцкімі справамі.

Але вось надышоў час самога пасвячэння. Дагавор аб «сумесным існаванні» тэрмінам на пяць гадоў падпісалі ўслед за дэканам старасты патокаў 1-га курса мехмата. Дагавор аб «ненападзенні» паміж дэканатам і студэнтамі (у 2-х экземплярах) падпісалі хімікі. «Клянёмся!» — паўтарылі за вядучымі словы клятвы ўсе першакурснікі.

...На пяць прыступак сталі адпаведна студэнты ўсіх пяці курсаў фізфака, паведаміўшы пачынаючым, што дайсці да вяршыні можна толькі тады, калі спасцігнеш формулу святла, формулу сумненняў, формулу надзеі, формулу шчасця...

Вернемся з апошняй прыступкі на святочныя факультэты разгледзець асаблівасці афармлення, пачытаць святочныя газеты, усміхнуцца гумарыстычным аб'явам. Нядрэнна выкарысталі хімікі пастаянныя стэнды. Прыемна здзівілі студэнты ФПМ, прадставіўшы ў карціннай галерэі «рэпрадукцыі» работ вядомых мастакоў у інтэрпрэтацыі ранне-, сярэдне- і каля-ФПМаўскага перыядаў. А вось фізікі прадэманстравалі нетактоўныя адносіны да студэнтаў-суседзяў. Патугі на жарты ў бок матэматыкаў —не смешныя.

Размах мехмата здольны ўразіць кожнага. Вышэйшыя за чалавечы рост вобразы, навеяныя Хэрлуфам Бідструпам, не змясціўшыся на сценах, пазаймалі частку падлогі ў калідоры. На адным толькі афармленні можна было ўжо «выдыхнуцца», але ж мерапрыемствы Дзён мехмата ахапілі тры дні! Сакрэт «шчодрай» праграмы нескладаны: штабы па падрыхтоўцы Дзён існавалі на кожным патоку. Каардынавала іх работу нарада старшынь, што працавала ў непасрэдным кантакце з аргкамітэтам, якім кіраваў сакратар камітэта камсамола факультэта. Цэнтралізаванае кіраўніцтва, памножанае на ініцыятыву кожнага,— вось і ўсё.

Мехмат адмовіўся ў гэтым годзе ад традыцыйнай прэс-канферэнцыі выкладчыкаў і студэнтаў. І, як часта здараецца, новым аказалася амаль забытае: поўную залу гледачоў сабраў КВЗ паміж камандамі выкладчыкаў і студэнтаў. Без папярэдняй падрыхтоўкі (членаў каманд вызначылі перад самай сустрэчай) абодва бакі ўдзельнічалі ў добра арганізаваных конкурсах, стварылі захапляючыя экспромты.

Колькі часу, працы, эрудыцыі канцэнтруюць Дні! Але ёсць ва ўсіх іх агульны недахоп: яны замыкаюцца ў рамках факультэта. Трохгаловы змей на эмблеме Дзён-хімікаў сам сябе з'ядае — красамоўная сімволіка.

У чым жа выхад? Патрэбна выносіць уласныя ідэі на шырокі суд, не баяцца крытычнага погляду. Магчыма, гэта дапаможа пераступіць цераз выпадковае і наноснае, што паяўляецца часам нават у самых цікавых праграмах.

Існуюць трывалыя сувязі ў хімікаў з біёлагамі. Ансамбль «Арніка» біяфака не толькі госць, але і ўдзельнік Дзён хіміка. Некалі запрашалі адзін аднаго на прафесійныя святы хімфак і ФПМ, але потым гэтыя сувязі, на жаль, распаліся. У тэатральнай гасцінай мехмата і на капусніках астатніх факультэтаў выступаюць госці з іншых ВНУ, з іншых гарадоў. Іх спектаклі-віншаванні не заўсёды сцэнічна вытрыманы, часам зацягнуты. А побач на суседнім факультэце самадзейны тэатр узнімае праблему, зразумелую і цікавую кожнаму ва універсітэце.

— Факультэцкім Дням не хапае галоснасці, — паскардзіліся дзяўчаты з ФПМ, — хацелася б паглядзець, як праходзяць святы ў іншых, ды і сябе паказаць.

— Мы выступалі ў гэтым годзе ў тэатральнай гасцінай мехмата з тым, каб у наступныя Дні матэматыкі выступілі ў нас, — гавораць студэнты-фізікі.

Плануюць расшырэнне ўнутрыуніверсітэцкіх кантактаў і хімікі.

Ёсць, зразумела, у Дзён свае цяжкасці. Не «прабіць» актавую залу, не знайсці свабодную аўдыторыю для рэпетыцыі, не дастаць касцюмы... Але цяжкасці абуджаюць з'яднанасць, напорыстасць і ініцыятыву — якасці, без якіх немагчыма зрабіць факультэцкае свята святам кожнага.

Т. САХАШЧЫК.

# ЛЕТАПІС БДУ

**(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8, 10, 11, 12, 13, 14, 15, 16).**

**1963 год**

**Люты**

Пачаліся заняткі на факультэце грамадскіх прафесій па спецыяльнасцях: хормайстар, кіраўнік танцавальнага калектыву, дырыжор аркестра народных інструментаў, рэжысёр самадзейнага драматычнага тэатра. Тэрмін навучання 3 гады.

**Сакавік**

У сувязі са зваротам сакавіцкага Пленума ЦК КПСС камітэт камсамола стварыў штаб працоўных спраў, які заняўся арганізацыяй працы студэнтаў у калгасах і саўгасах Беларусі.

**Чэрвень**

Упершыню разам з іншымі атрадамі з Беларусі ва Уральскую вобласць выехалі студэнты-фізікі.

**Снежань**

Першая матэматычная алімпіяда выпускнікоў сярэдніх школ.

Аспірант хімфака В. Гараеў стаў чэмпіёнам краіны ў трайным скачку. Пяць студэнтаў універсітэта сталі майстрамі спорту СССР, 60 — спартсменамі першага разраду, 720 выканалі нарматывы другога разраду, 56 студэнтаў з'яўляюцца членамі зборных каманд Беларусі.

**1964 год**

**Студзень**

Клуб інтэрнацыянальнай дружбы пачаў перапіску з клубам Міжнароднай дружбы Познаньскага універсітэта імя А. Міцкевіча.

**Сакавік**

Адкрыццё на гістфаку нумізматычнага кабінета, адзінага ў ВНУ краіны.

Стварэнне па ініцыятыве партыйнага бюро юрфака грамадскага савета прававой дапамогі насельніцтву.

**25 жніўня**

Адкрыта праблемная навукова-даследчая лабараторыя эксперыментальнай біялогіі.

**14 верасня**

Арганізацыйнае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Узлёт», створанага пры газеце «Беларускі універсітэт».

**12 лістапада**

Партыйны камітэт прыняў рашэнне аб арганізацыі лекторыя па пытаннях культуры, навукі, мастацтва.

**13 лістапада**

Стварэнне першай студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі на фізічным факультэце.

**(Працяг будзе).**



## ЧАС КВІТНЕННЯ АЛЕШЫНЫ...

**Каб гэта быў адно час квітнення алешыны! Спакон вякоў гэта і час першай песні жаўрука, звонкіх вясновых ручаёў, першых у гаях пралесак і маладога неспакою галасоў, што гукаюць вясну. І выходзяць людзі насустрач вясновай кветцы і блакітнай далечы, юначай мары, сэрцабіццю, звонкаму, як жаўрук у небе, высокаму, як першамайскія сцягі, што праплываюць над урачыстымі святочнымі калонамі, якія пройдуць каля Дома ўрада, каля помніка дарагому Ільічу, імя якога носіць і наш універсітэт. З вясновых жаўруковых і пралескавых прагалін у шырокі свет паэзіі рвуцца маладыя галасы паэтаў-студэнтаў. Час квітнення алешыны — час завязі. Гэтае адчуванне — асноўнае ў вершах, з якімі сустракаюць свой студэнцкі Першамай «узлётаўцы», якім сёння ўзнёсла пішацца, мроіцца, думаецца. Час завязі — прадвесце плёну. Выспяваць жа яму, непаўторнаму, чым важчэйшаму!..**

**Алег ЛОЙКА,**
**кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».**

**Віктар ВАБІШЧЭВІЧ**

### ПЕСНІ МАЁЙ ВЁСКІ

Родныя песні роднае вёскі —
Летніх змярканняў гучанне.
Згадваю рэчку, вёслаў усплёскі.
Бачу палёў красаванне.
Колькі ў вас шчырасці,
родныя песні.
Колькі пяшчоты крыштальнай!
З сонцам — праводзіце снег напрадвесні.
Будзіце — з зоркай світальнай.
Краю майго хараство
вы ўвабралі,
Спеў салаўя непадробны.
З песнямі ў жыцце нас
калыхалі,
Песню дарылі ў дарогу.
Вы — блакіт валошкавы неба,
З хатай бацькоўскай спатканне,
Маці ля цёплага бохана хлеба.
З вечнай над поплавам каняй.

***

Можа дзесь у гушчэчы
пушчанскай
Ты вартуеш спрадвечны
спакой,
Ці лілеяй жывой нарачанскай
Расквітнела на хвалі якой?
Дзе ты? Хто ты? Падай мне
свой голас.
Мне ўявіць цябе сіл не стае.
Не падкажуць ні травы, ні
колас,
Дзе звіваеш вяночкі свае.
Я гукаю, шукаю ўсюды —
Злым маўчаннем адказвае ціш.
Не сплысці толькі марам
нікуды.
Час, надзей маіх не спапяліш.



# РУЖОВЫ РАНАК

*Літаратурная старонка*



**Ала КАНАПЕЛЬКА**

### На Палессі вясна

На Палессі вясна —
Раўчукі, раўчукі.
Засвяціла вярба сонцы-коцікі.
І палошчуць вятры
Ручнікі-ручнікі —
Туманы белабокія коцяцца.

Кружаць у небе буслы
Над сялом, над сялом.
Шыбы чыстыя сонцам
залоцяцца.
Перасветы бяроз
Пад крылом, пад крылом,
Паплавы пазаймаліся лотацццю.

На Палессі вясна —
Жаўрукі, жаўрукі.
Мурагі на пагорках
цянюткія.
Пазірае сяло —
З-пад рукі, з-пад рукі
Жураўлінае неба паўнюткае.

Выток; глыток; у грудзях —
халадок;
Расстайных пралескаў смутак...
Новых дарог непачаты
клубок —
Бярозавік некрануты.

### ЧАС КВІТНЕННЯ АЛЕШЫНЫ

Час квітнення алешыны,
Белы велюм завей.
Перад кім і ў чым грэшная?..
Вецер косы заўе.

Зерне дробнае, горкае
Па вясне прарасце.
Шышак чорнымі гронкамі
Дзень яе адцвіце.

На снягах боль замешаны —
Набрыняла кара.
Час цвіцення алешыны...
Завязь, лёс, не карай!..

**Вольга САВАСЦЮК**

***

Сініцца, мроіцца вёсачка
ў квецені,
У кустах салавейка пяе,
І вянок з васількоў сініх
сплецены,
З гэткіх сініх, як вочы мае.

Уцякае ўдаль сцежачка
вузкая —
То нізінкай, то горкай
вядзе, —
Ой, зямля ты мая беларуская,
Не забуду цябе я нідзе!..

***

А я яшчэ такая маладая!..
Мне толькі васемнаццаць
надыходзіць!
Яшчэ мяне каханы не чакае,
А дзесьці адзінока ў скверы
ходзіць.

І буду жыць я не па тых
гаданнях,
Што хоча мне цыганка
напрарочыць,
Бо знаю, не міне мяне
спатканне,
Калі хтось адзінока ў скверы
крочыць!..

**Тамара КАЛЬВІНКОЎСКАЯ**

***

Не прымаю пустых абяцанкаў!..
У жыццё трэба верыць, інакш
Самы светлы з усіх
світанкаў
Чужаком будзе, а не наш.

У жыццё трэба крочыць смела,
І тады ты — паэт, мастак!
І рукам тваім, самым умелым,
Сэрца стукаць будзе ў такт.

І пустых не будзе памкненняў,
І тваім стане цэлы сусвет,
І аднойчы з твайго задумення
Хтосьці адзіны цябе пазаве.

### ВЕЦЕР

Разгуляўся ў вёсцы позні
ноччу,
Рваў на пуні састарэлы дах,
Па-хлапечы са сцяжынкі
збочыў,
Яблыкі абтрос ва ўсіх садах.
Вылятаў знянацліва з-за гаю,
Перакульваць рваўся кожны
стог...
Каб ён ведаў, як цябе кахаю,
Вырваць з сэрца можа б
дапамог.

*студэнтка I курса філфака*

Луг, дзе ты мае косы
расплёў,
І рака, па якой два вяночкі —
Твой і мой — блізка-блізка
плылі,
І бярозка з зялёным дубочкам,
Што галінкі пераплялі...
А мо паспрабаваць?..
А мо раптам?..
Усё роўна цяпер не засну,
Дайце самых ярчэйшых
фарбаў,
Намалюю для вас вясну!..

**Сяргей ЧЫГРЫН**

### СТАГІ ПАМЯЦІ

Стагі памяці
Спаць не даюць,
Стагі памяці
Маўчаць і пяюць.
Стагаванне ўсё жыццё,
Кожны дзень стагаванне.
Стагі памяці — адкрыццё,
Стагі памяці — вяртанне.
Робім цвёрдыя крокі
Пад сонцам і замеццю...
Як свет шырокі,
Стагі памяці.



**Сяргей КАВАЛЁЎ**

### ТРЫЯЛЕТ

Б'е з глыбіні тваіх вачэй.
Жыве гаючая крыніца,
І нешта дзіўнае таіцца,
Б'е з глыбіні тваіх вачэй.
Душа ніколі не збаіцца
Сказаць праз марыва начэй:
«Б'е з глыбіні тваіх вачэй,
Жыве гаючая крыніца!..»

**Алена ПАРФЕЯВЕЦ**

### СПЯВАК

*Памяці французскага спевака і кампазітара Джо Дасэна*

Хто ты, чалавек у касцюме
белым?
Як на эшафот, выходзіш
на сцэну
І адчуваеш сэрцам збалелым,
Што побач не людзі, а сцэны,
сцэны...
А значыць зноўку аб іх
каменнасць
Табе разбівацца — жорсткая
кара,
Верыць, што гэта хоць штосьці
зменіць...
Сцены вакол, а ў цябе...
гітара.
Што ж, пачынай. Ты ведаеш,
праўда,
У палоне сцен дабрыні багата.
Ты будзеш імкнуцца вызваліць
радасць,
Ты будзеш імкнуцца разбурыць
краты:
«Слухайце, людзі!
Свет дзіўны ёсць.
Слухайце, людзі!
Слухайце, людзі,
Забудзьце злосць,
Прагнасць забудзьце.

Слухайце, людзі,
Я гавару,
Свет гэты вечны
Вам я дару:
Добрымі будзьце!»
Толькі чаму абрываецца
песня?..
Стыне на ўзлёце высокая нота.
А над зямлёю, як вецер вясні,
Сцены глухія рушыць пяшчота.

**Таццяна КАВАЛЕНКА**

### Ажыла вясновая зямля...

Ажыла вясновая зямля,
Быццам я ад твайго
пацалунка,
Колькі слаўных навокал
малюнкаў!..
Як шкада: не мастак слаўны я!..

Бо я б дзень і другі малявала,
Ажывалі б тады зноў і зноў
Лес, якому я песні спявала,



**Світанак на Камсамольскім возеры...**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

30 красавіка 1981 г.

АТ 02227 Заказ 746.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ